ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

'90

ЧАЦВЕР
19
КРАСАВІКА
№ 13(1642)

ОРГАН ПАРТКОМА,
РЭКТАРАТА,
КАМСАМОЛЬСКАГА
І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА
ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

ЛЕНІНСКАЯ СПАДЧЫНА

Дапаможнік для роздуму

Мы ўсё бяром пад сумненне. Гэта добра — будзе рух наперад. Але калі мы пачынаем сумнявацца літаральна ва ўсім, наўрад ці ад гэтага будзе некаму карысць. І не дзіва, што сёння часта чуем: «Няма для іх нічога святога. Як дзяцей выхоўваць, на якіх прыкладах? Нават да Леніна дабраліся».

І сапраўды, у абстаноўцы рэальных палітычных дыскусій Ленін стаў мішэнню для крытыкаў. Многія спрабуюць зрабіць геніяльнага палітыка хросным бацькам тэрору. Маўляў, вось як з'явілася сталіншчына. Многія ідуць яшчэ далей: пераконваюць у тым, што «крамлёўскі летуценнік» не ведаў жыцця і навязваў нам сацыялізм, да якога ні краіна, ні народ не былі гатовы, і зараз не супраць вярнуцца да лютага 1917. Карацей, фігура Леніна зноў у цэнтры кіпучых страсцей.

Чаму так атрымалася? Некаторыя даследчыкі жыцця і дзейнасці У. І. Леніна лічаць, што адна з прычын такога ўсплеску — неадпаведнасць таго партрэта, які насаджаўся ў народзе афіцыйнай гісторыка-партыйнай навукай на працягу дзесяцігоддзяў, рэальнаму абліччу кіраўніка правячай бальшавіцкай партыі і Савецкай дзяржавы ў цяжкі перыяд грамадзянскай вайны ў краіне. Зараз мы асабліва ўважліва ўдумваемся ў сэнс ленінскі ідэй, імкнёмся зразумець логіку яго думак і паступкаў. Магчыма, у нейкай ступені зрабіць гэта вам дапаможа выстаўка, арганізаваная да 120-годдзя са дня нараджэння У. І. Леніна аддзелам масавай работы бібліятэкі. Калі вы знойдзеце час зазірнуць у бібліятэку (трэці паверх галоўнага корпуса), вам прапануюць пазнаёміцца з ленінскай спадчынай, прачытаць старонкі біяграфіі, а таксама прааналізаваць публікацыі, якія змяшчаюцца ў газетах і часопісах зараз. Тут шырока прадстаўлена навуковая літаратура, выразкі з перыядычных выданняў.

Зноў вясна! І зноў Дні фізіка вітаюць універсітэт! Урачыстае шэсце, прэс-канферэнцыя выкладчыкаў, шматлікія прыемныя нечаканасці ў час святкавання, спакусы прыняць удзел, паспрабаваць, паглядзець — у вясёлых справах фізікі сябе не шкадавалі. Як і ў вучобе таксама.



ІНФАРМБЮРО

Хутка лета

Звычайна, збіраючыся летам адпачыць, мы задоўга да вакацый пачынаем запасіць грошы. Усё адкладваем з і так не надта вялікай стыпендыі — на адпачынак сума патрэбна немалая. І кожны раз хвалюемся: назбіраем неабходны капітал ці не. Разумеем, што без яго не відаць нам поўначы.

Намеснік старшыні студэнцкага прафкома Н. Туромша запэўніла, што ў кожным правіле ёсць выключэнне, і не заўсёды, каб адпачыць, патрэбны фінансы. Напрыклад, калі вы пажадаеце правесці свае канікулы ў лагеры працы і адпачынку «Феадасійскі». Усяго арганізавана чатыры змены:

першая: з 25 чэрвеня да 16 ліпеня;

другая: з 17 ліпеня да 7 жніўня;

трэцяя: з 8 да 29 жніўня;

чацвёртая: з 30 жніўня да 28 верасня.

Тут вам гарантуюць начлег, трохразовае харчаванне і прыемны адпачынак (безумоўна, і працаваць патрэбна). У прафкоме студэнтаў чакаюць вашы заявы.

З ДАЛЁКІХ ВАНДРОВАК

І песняй сэрца абуджаць

ТЭРМІНОВА Ў НУМАР

Хто ведае, магчыма, каб ні сённяшняе пацяпленне ў адносінах да рэлігіі, наша размова з мастацкім кіраўніком народнай харавой капэлы Маргарытай Дзмітрыеўнай Лапкоўскай не адбылася б. Не было б гэтых шчырых, узнёслых слоў аб гасціннасці польскага народа, не было б сапраўднага гонару за сябе і свой калектыў, што не падкачалі, паказалі сябе ва ўсёй прыгажосці, а галоўнае — яшчэ раз пераканалі ў непаўторнасці і мілагучнасці беларускай народнай песні.

Увесь час (за выключэннем некалькіх гадзін, адведзеных на сон) яны спявалі. У час канцэртаў і пасля іх — на прыёмах у гонар беларускіх гасцей. Па-беларуску, па-польску, па латыні, а таксама на рускай, англійскай, французскай мовах. Слухачы былі ашаломлены: каб так выступалі самадзейныя артысты — не можа быць. І ўсё ж гэта так: меладычныя, задушэўныя песні ліліся менавіта з вуснаў аматараў народнай творчасці. А шчыры, сардэчны прыём прысутных заахвочваў іх, прымушаў укладваць у кожны гук сваю душу.

Свет цудоўнага ўзяў у палон іх ажно на восем дзён. Толькі ўсё прыемнае, на жаль, хутка канчаецца. У мінулым засталіся канцэрты ў Кракаве, Катавіцы, Чэнстахове, Вадовіцы, Саснаўцы і іншых гарадах Польшчы, куды народная харавая капэла БДУ была запрошана Прыхадской абшчынай падняцця Святога Крыжа ў асобе ксяндза Юзафа Марака для выступленняў у культавых будынках.

Ніхто не чакаў такога сардэчнага прыёму. Але словы ксяндза Марака растлумачылі ўсё: «Белая Русь, Літва, Украіна і Польшча — адзіныя народы, і паміж імі не павінна быць межаў. Яны абавязаны жыць у міры і згодзе». Важкі ўклад у справу яднання народаў уносяць і вось такія паездкі самадзейных калектываў.

Развітваючыся, прыхажане падарылі універсітэцкім артыстам відэакасету, на якой запісаны некалькі канцэртаў капэлы. Дарэчы, М. Д. Лапкоўская спадзяецца, што знойдуцца жадаючыя паглядзець запісы, тады ўдзельнікі капэлы арганізуюць такі прагляд, напрыклад, у кафэ «Гаўдэамус».

І яшчэ адна навіна. У час гастроляў самадзейныя артысты пабывалі на дыскатэцы ва універсітэце г. Катавіцэ і былі здзіўлены ўзроўню яе правядзення і майстэрству дыскжакея Гжэгажа Куша. Ён у сваю чаргу ветліва згадзіўся прыехаць у БДУ і правесці некалькі дыскатэк для нашых студэнтаў. Так што, сачыце за аб'явамі студэнцкага клуба.

...Магчыма, каб ні сённяшняя перабудова, не было б гэтай паездкі. І не было б таго ўзнёслага настрою, які, упэўнена, надоўга.

Географы заклапочаны

У НАВУКОВЫХ КОЛАХ

Для кожнага з іх гэтыя праблемы даўно знаёмыя. Ім, як кажуць, па доўгу службы даводзіцца займацца пытаннямі рацыянальнага выкарыстання і аховы прыроднага асяроддзя. Вывучаюць, параўноўваюць, робяць вывады. Добра б сабрацца разам, выказаць набалелае, прадпрыняць нейкія крокі, падзяліцца вопытам — такая думка асяніла маладых вучоных нашага універсітэта. З гэтай нагоды і вырашылі запрасіць сваіх калег-географаў на VIII навуковую канферэнцыю.

У БДУ з'ехаліся маладыя вучоныя з розных гарадоў СССР. У кожнага з іх было што сказаць: непакоілі праблемы сельскагаспадарчага прыродакарыстання ва ўмовах аграрнай рэформы, неабходнасці рэгулявання стоку рэк Беларусі, уздзеяння жывёлагадоўчых ферм на навакольнае асяроддзе, рацыянальнага выкарыстання і аховы лясоў, забруджвання глебы цяжкімі металамі, міграцыі радыенуклідаў у ландшафтах Паўднёвага Усходу Беларусі і многія іншыя. Усе гэтыя пытанні грунтоўна абмяркоўваліся на пленарным пасяджэнні і секцыйных. Апошніх было чатыры: ландшафтныя прынцыпы аховы і рацыянальнага выкарыстання прыроднага асяроддзя, пытанні меліярацыі і рацыянальнага выкарыстання глебы, водныя рэсурсы і іх рацыянальнае выкарыстанне, сацыяльныя і эканоміка-геаграфічныя аспекты прыродакарыстання. Вучоныя мелі магчымасць пазнаёміцца са шматлікімі стэндавымі дакладамі.

Канферэнцыя закончылася, а яе ўдзельнікі яшчэ сур'ёзней задумаліся аб ахове прыроднага асяроддзя, бо пачутыя лічбы ўразілі і прымусілі зрабіць вывад: «калі не я, то хто?» Сапраўды, усё тое, што датычыць захавання прыроды,— справа геграфаў.

Дзяжурная служба «Беларускага універсітэта»: Зінаіда АЛЯШКЕВІЧ, Сяргей ГРЫЦ (фота).

«КОНЕЙ НА ПЕРАПРАВЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ»

ЗАМЕСТ ВІЗІТКІ. Ён прайшоў шлях ад шахцёра да прафесара. 16 гадоў пражыў у інтэрнатах і 9 вучыўся на мізэрныя стыпендыі. Сутыкнуўся з бюракратызмам і адкрытым непрыманнем сваіх ідэй...

І ўсё ж ён аптыміст. Ён перакананы: наша грамадства можа быць квітнеючым і шчаслівым, калі ўзамен абсурднай адміністрацыйна-камандная сістэмы здолее пабудаваць разумную сістэму кіравання, якая абапіраецца на дэмакратыю, планавырначную эканоміку і незалежныя моцныя мясцовыя Саветы.

Такая ўпэўненасць нарадзілася ў кандыдата ў народныя дэпутаты Мінскага гарадскога Савета, загадчыка кафедры кібернетыкі БДУ імя У. І. Леніна, доктара тэхнічных навук, прафесара Аляксандра Сяргеевіча МІХАЛЁВА не раптам. Яна выношвалася гадамі, будавалася на аснове ўласных думак і меркаванняў. Праўда, штуршок быў. Аднойчы А. С. Міхалёву давялося працаваць над дакладам да першай гарадской канферэнцыі па робататэхніцы. Дакументаў побач — і «адкрытых», і для службовага карыстання. Чым больш Аляксандр Сяргеевіч гартаў іх, тым больш сумныя лічбы паўставалі. Сярод 26 сталіц саюзных рэспублік і гарадоў-мільянераў Мінск займае: па забеспячэнню жыллём — 13-е месца, колькасці ўрачоў — 16-е, колькасці прадпрыемстваў грамадскага харчавання — 20—25-е, месц у тэатрах — 22-е... Насельніцтва вырасла за пасляваенныя гады амаль у пятнаццаць разоў, а Мінск па-ранейшаму застаецца горадам-заводам.

Напэўна, час мяняць яго інфраструктуру, «перакачаўшы» частку насельніцтва з прамысловасці ў сферу абслугоўвання. Лёгка сказаць: змяніць інфраструктуру, толькі як зрабіць гэта? Вось тут і аказаліся дарэчы прафесійныя навыкі Міхалёва-вучонага: аналітычны склад розуму, неардынарнасць мыслення, нечаканасць вывадаў і фармулёвак. Ён паставіў пытанне так: справе дапаможа механізацыя і рабатызацыя вытворчасці. На жаль, нярэдка даводзілася пераконваць некаторых кіраўнікоў у тым, што за робатамі — будучыня, і выкарыстанне робататэхнікі дазволіць павысіць прадукцыйнасць працы, знізіць сабекошт прадукцыі, а галоўнае — у нас з'явяцца «лішнія» рукі, якія можна выкарыстаць у сферы абслугоўвання.

Сёння мы ствараем законы аб зямлі, аб арэндзе. Мы хочам навучыць чалавека працаваць творча, даць яму магчымасць адчуць сябе гаспадаром. Мы гатовы заахвочваць яго маральна і матэрыяльна. Аляксандр Сяргеевіч Міхалёў выдатна памятае іншае. Праз яго рукі беззваротна праходзілі будучыя Кулібіны, Капернікі, Энштэйны... Ураўнілаўка не дала ім магчымасці развіць і ўдасканаліць свае здольнасці і талент. Гэта сёння мы пачынаем весці гаворку і дзе-нідзе прыступаем да стварэння студэнцкіх груп у залежнасці ад узроўню падрыхтаванасці, а не раўняючыся на серадняка. А. С. Міхалёў таксама прыхільнік такога навучання. Менавіта таму да яго на кафедру трапляюць толькі таленавітыя людзі, якія могуць сказаць у робататэхніцы нешта сваё, новае. Тут нічога не прымаецца, як пастулат, аксіёма. Толькі той, хто ўмее заўважаць недахопы, валодае крытычным поглядам на рэчы і з'явы, зможа зрабіць нешта вартае.

Моладзі ёсць з каго браць прыклад. Яна паважае таленавітых. Напэўна, таму і вылучылі А. С. Міхалёва кандыдатам у народныя дэпутаты Мінскага гарадскога Савета народных дэпутатаў па Курчатаўскай выбарчай акрузе № 93. Ён, хто амаль палову свайго жыцця правёў у студэнцкай аўдыторыі, добра ведае патрэбы моладзі, заўсёды імкнецца дапамагчы ёй. Здараецца, для вырашэння таго ці іншага пытання не хапае паўнамоцтваў, таму і даў Аляксандр Сяргеевіч згоду балаціравацца на выбарах. Якімі ж пытаннямі ён будзе займацца, калі атрымае падтрымку выбаршчыкаў?

З АФІЦЫЙНЫХ ХАРАКТАРЫСТЫК. Прызнаны ў краіне спецыяліст у галіне пабудовы сістэм кіравання робатаў, А. С. Міхалёў у 1981 годзе быў запрошаны ў Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна для развіцця новай спецыялізацыі «Кібернетыка. Сістэмы кіравання робатаў». Па яго ініцыятыве ствараецца вучэбна-навукова-вытворчае аб'яднанне «БДУ імя У. І. Леніна — НВА «Гранат», што дало магчымасць упершыню ў рэспубліцы забяспечыць мэтавую падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў ў галіне робататэхнікі.

Навукова-тэхнічныя распрацоўкі прафесара Міхалёва вызначаюцца навізной і арыгінальнасцю, апублікаваны ў больш чым 190 навуковых працах, абаронены 82 аўтарскімі насведчаннямі, 25 з якіх патэнтуюцца ў 14 краінах свету, укаранёны вядучымі робатабудаўнічымі прадпрыемствамі СССР. Яны ўнеслі важкі ўклад у вырашэнне шэрагу важных народнагаспадарчых задач, аказалі істотнае ўздзеянне на навукова-тэхнічную палітыку вядучых робатабудаўнічых арганізацый рэспублікі і краіны, выклікалі камерцыйную зацікаўленасць не адной замежнай фірмы.

МАНАЛОГ-СПОВЕДЗЬ.

— Я не магу гаварыць пра жыццё, як пра свята, але і скардзіцца на лёс таксама не буду. Я ўдзячны яму хаця б за тое, што прымусіў мяне ўсе гады заставацца маладым. А гэта, паверце, няпроста і магчыма толькі тады, калі сэрцы здольны біцца ва ўнісон. Інакш нічога не атрымаецца, ты не зразумееш таго, хто маладзей за цябе больш чым удвая.

Моладзь — наша будучыня. І якім ёй быць, у многім залежыць ад кожнага маладога чалавека. Але паступова я прыйшоў да вываду, што і ад нас, старэйшага пакалення, гэта залежыць не ў меншай ступені. Растлумачу чаму. Калі нам неабходны былі рабочыя рукі для прамысловых прадпрыемстваў, мы з ахвотай прымалі ў Мінск усіх, хто пажадае. Але, нарэшце, прамысловасць перанасычылася, і мы зачынілі дзверы, пакінуўшы на той бок і таленавітую моладзь.

Захацела, напрыклад, тэлебачанне ўзяць выпускніка-рэжысёра, а мы яму: «Прад'явіце прапіску». Нічога не заставалася маладому чалавеку, як падацца на перыферыю. А дзе там талентам развівацца? І тыя, што былі, загінуць.

Вось так паступова горад страчвае свой інтэлектуальны патэнцыял. Таму і з'явіўся ў маёй перадвыбарнай праграме пункт, у якім запісана: буду змагацца за прадастаўленне мінскай прапіскі і працаўладкавання іншагароднім выпускнікам мінскіх навучальных устаноў з востра дэфіцытнымі для горада спецыяльнасцямі.

Вядома, не магу абысці ў сваёй перадвыбарнай праграме самую надзённую сённяшнюю праблему — экалагічную. Мне здаецца, не трэба паўтараць тое, што было сказана ўсімі папярэднімі кандыдатамі. Выкажу адну асабістую прапанову, за рэалізацыю якой буду змагацца незалежна ад таго, выберуць мяне народным дэпутатам ці не.

Уявіце сабе такую сітуацыю. Вы зайшлі ў магазін, купілі кавалак каўбасы ці сыру, але, наслухаўшыся і начытаўшыся розных страхаў, есці баіцеся. Вы тут жа, у магазіне, правяраеце прадукт на радыеактыўнасць і ўтрыманне нітратаў. Прычым не проста глядзіце на шкалу і, нічога не зразумеўшы, махаеце рукой, а супастаўляеце свае паказчыкі з кантрольнымі, якія змешчаны побач. Фантастыка? Пакуль што так. Але, на маю думку, зрабіць гэта не так ужо і складана — забяспечыць кожны прадуктовы магазін дазіметрамі і прыладамі па вымярэнню колькасці нітратаў.

Мае калегі, сябры часта пытаюць у мяне: «Ці не будзе перашкаджаць на выбарах тое, што ты камуніст?». Шчыра кажучы, я таксама думаў аб гэтым, але прайграць не баюся. Гэта не трагедыя. Насцярожваюць адносіны да членаў КПСС, агульнае ашальмаванне партыі. А ці прымалі ўдзел у будаўніцтве камандна-адміністрацыйнай сістэмы 18 мільёнаў простых камуністаў? І чаму мы павінны звязваць з імі ўсе нашы няўдачы?

Ёсць у дыялектыцы выдатны закон адзінства і барацьбы супрацьлегласцей. Гэта асноўны закон развіцця. У адносінах да партыі яго прымяніць нельга, бо ў нас няма гэтых супрацьлегласцей. Нельга навучыцца гуляць у шахматы, не маючы партнёра. У партыі яго не было дзесяткі гадоў. Толькі і шматпартыйная сістэма наскокам не складваецца. Сёння мы не маем другой палітычнай структуры, якая дапамагла б устанавіць раўнавагу. І каб стварыць яе, патрэбна шмат часу.

Ці застануся ў КПСС, калі будзе іншая партыя? На гэта пытанне даволі часта спрабую даць адказ. Мне непрыемна ўсведамляць, што я член той жа партыі, у якой у свой час быў Берыя, Сталін. Але коней на пераправе не мяняюць, і абавязак кожнага камуніста — дапамагчы партыі зноў заваяваць давер народа.

Вось такімі думкамі хацеў бы падзяліцца са сваімі выбаршчыкамі на сустрэчах. Праўда, аналізуючы папярэднюю выбарчую кампанію, заўважыў, што сярод прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат вельмі модна было даваць авязаранні, часам самыя неверагодныя. Лічу, што мы не маем на гэта права. Я магу гарантаваць выбаршчыкам толькі непахіснасць сваіх перакананняў, поглядаў, памкненняў і тое, што буду змагацца за ажыццяўленне іх наказаў.

СУБ'ЕКТЫЎНАЕ МЕРКАВАННЕ. Ёсць людзі, якія не скардзяцца на лёс, а прымаюць яго такім, які ён ёсць. Не, не таму, што яны, як кажуць, не могуць стукнуць кулаком па стале. Не таму, што маюць мяккі характар. Я б сказала наадварот: яны ў поўнай меры валодаюць моцнай сілай волі, вялікай вытрымкай, мэтанакіраванасцю, рашучасцю. Проста ў жыцці ім давялося ўсяго дабівацца самім, і яны перакананы, што так і павінна быць.

...Яму часта хацелася ўсё кінуць, забыць, на ўсё махнуць рукой і застацца адзін на адзін з сабой, са сваімі думкамі, з цішынёй нарэшце. Але хутка мінорны настрой праходзіў — і зноў за работу, у кругаварот будняў і спраў, з-за якіх, бывае, не заўважаеш ні выхадных, ні свят. І ўсё ж якая гэта асалода — увесь час адчуваць напружанне думак, пачуццяў. Пастаянна дзейнічаць, тварыць, жыць.

З. МІХНЕВІЧ,
Фота С. ГРЫЦА.

ЁН БЫЎ САПЁРАМ

Сапёр памыляецца толькі адзін раз. Ён быў сапёрам, але яму пашчасціла не памыліцца, выжыць.

Чэрвень сорак першага. У выпускнікоў Ленінградскага ваенна-інжынернага вучылішча імя Жданава — размеркаванне. Міхаіл Бондар разам з трымя аднакурснікамі — зараз ужо кадравымі афіцэрамі, накіраваўся ў Закаўказскую ваенную акругу. 21 чэрвеня, у суботу, былі на месцы. Далажылі аб прыбыцці, схадзілі на гулянне, пасля якога ажыўлена абмяркоўвалі асабістыя справы. І тут — сігнал баявой трывогі. Не паверылі, дакладней, не хацелі верыць, што здарылася нешта страшнае. Да апошняй хвіліны запэўнівалі сябе, што гэта проста вучоба. Нават словы камандзіра аб тым, што пачалася вайна, успрымаліся з цяжкасцю, хаця разумелі, што так жартаваць ніхто не стане...

Потым былі паспешлівыя зборы, ад'езд на вызначанае месца. Амаль адначасова — загад Сталіна перасячы граніцу з Іранам, абяззброіць Іранскую армію і не дапусціць наступлення нямецкіх падраздзяленняў, якія былі сцягнуты да меж Арменіі і Азербайджана.

— Рашэнне Сталіна было, на маю думку, адзіна правільным у той час, бо пагроза існавала не толькі з боку Японіі, але і Ірана, Турцыі, Ірака. На прамаруджванне часу не заставалася,— з нейкім сумам у вачах расказвае Міхаіл Емяльянавіч Бондар.— Толькі пра ўсе гэтыя падзеі потым ў аўтабіяграфіі пісалі коратка: Крымскі фронт — распаўсюджвацца забаранялася, таму што (зноў жа потым) такі тактычны ход палічылі няправільным. А ці лягчэй нам ад гэтага? Колькі давялося перанесці, пабачыць, вытрымаць. Фронт — не фронт, але разня была і там. Памятаю, спынішся ў вёсцы начаваць — недалічышся раніцай некалькі байцоў. Пойдзе афіцэр у горад — назад не вернецца.

Хутка і сапраўдная вайна пачалася. Крымскі фронт, Закаўказскі, Паўночна-Каўказскі, Ленінградскі, II Прыбалтыйскі. Шмат давялося вынесці Міхаілу Емяльянавічу за гады вайны. Але ні аб чым сёння не шкадуе, бо ўсё гэта — дзеля Перамогі. Інжынерныя падраздзяленні, у ліку якіх ён знаходзіўся, будавалі масты і пераправы, вялі разведку мясцовасці, мініравалі (ці наадварот размініравалі) палі, абсталёўвалі штабы, сховішчы для ваеннаслужачых і тэхнікі, падрывалі агнявыя кропкі ворага.

Напэўна, сапёрам даводзілася цяжэй за ўсіх. Яны працавалі пастаянна: наступленне ці адступленне — ні хвіліны адпачынку. І, здаралася, нервы не вытрымлівалі — гатовы былі лепш памерці, чым штодня знаходзіцца ў напружанні.

Нялёгка салдату займацца размініраваннем, калі да гэтага ён прайшоў сотні кіламетраў з аўтаматам за плячыма. Неабходны цярплівасць, уважлівасць, вытрымка, асцярожнасць, але адкуль яны будуць, калі ўжо,шчыра кажучы, свет не мілы, рукі і ногі дрыжаць ад стомленасці, а час — абмежаваны. Вось і страчвалася пільнасць,і чалавек гінуў ні за што, часам на сваёй жа міне.

— Аднойчы замініравалі поле,— успамінае М. Е. Бондар. Як камандзір узвода, я павінен быў кантраляваць работу. Падышоў да салдата, паразмаўлялі. Не паспеў адысці далёка — узрыў. І так неаднойчы. Як цяжка было страчваць сяброў.

Сам Міхаіл Емяльянавіч таксама быў двойчы кантужаны, мае тры раненні. Зараз радуецца, што хоць з тварам усё ў парадку.

Калі зайшла размова пра ўзнагароды, даведалася, што М. Е. Бондар удастоены двух ордэнаў Чырвонай Зоркі, двух — Айчыннай вайны II ступені, а таксама чатырнаццаці медалёў.

— Узнагароджвалі нас, вядома, не за выкананне нейкага аднаго задання, а за цэлы комплекс аперацый,— расказвае ветэран. Прычым толькі тады гаворка магла ісці пра ўзнагароду, калі нашы бралі верх. У адваротным выпадку ўсе твае подзвігі, няхай нават самыя неверагодныя, заставаліся ў тваёй памяці і ў памяці таварышаў.

Міхаіл Емяльянавіч з горыччу ўспамінае пра загінуўшых сяброў. Тым больш балюча зараз усведамляць, што многія з іх маглі жыць, калі б вышэйшае начальства больш давярала камандзірам на месцах і не пасылала людзей на верную смерць. Вось так паяўляліся безымянныя вышыні.

У такой мешаніне, як вайна, многае перабыталася: і жыццё чалавечае, і пачуццё справядлівасці, меры, годнасці. Сустракаліся на шляху сапёра і штрафныя батальёны. Аднойчы ён сам туды ледзь не трапіў. Праўда, усё абышлося добра, а вось на штрафнікоў з таго часу па-іншаму глядзець пачаў. Зразумеў, што сярод іх было шмат сумленных, непавінных людзей.

Верыў М. Е. Бондар у тыя гады ў Сталіна. Верыў, што ёсць ворагі народа. І ў атаку з воклічам: «За Радзіму! За Сталіна!» таксама хадзіў. Сёння жыццё прымусіла перагледзець ідэалы, пэўныя гістарычныя факты і падзеі. Але што б там ні гаварылі, а ён заўсёды застанецца салдатам з самай небяспечнай ваеннай спецыяльнасцю — сапёр. Гэта значыць да скону дзён будзе на пярэднім краі.

Л. ПРАЎЛОЦКАЯ.

«НАШЫ» ЗА МЯЖОЙ

Неба над Парыжам неабдымнае!

Два месяцы назад я гуляла па ранішнім Парыжы...

І гэта слова — Парыж — нічым асаблівым мне тады не здавалася. І раніца была зусім як у Мінску: звычайны дождж, звычайная цемра позняга сакавіцкага світанку, рэдкія людзі — самых «ранішніх» прафесій. Яны не размаўлялі, чужой мовы было не чуваць — сапраўды, як дома...

З неахвотай расказваю знаёмым аб дэталях ТАГО жыцця. Прытомнасць каля вітрын і прылаўкаў не траціла. «Дзікае буржуазнае» тэлебачанне суткамі не глядзела. У секс-кінатэатры не давялося пабываць, у вячэрнім рэстаране-таксама. І перастрэлак на вуліцах я не чула, і аголеных дзяўчат не бачыла. Дык што ж расказваць? Адно расчараванне толькі выклікаць.

Колькі ні выкажы ўражанняў пра славутыя аб'екты звычайных турысцкіх маршрутаў у Парыжы — яны так і застануцца тваімі эмоцыямі. А субяседніку патрэбны толькі яго асабістыя.

Звычайны маршрут турыста — гэта Эйфелева вежа, могілкі П'ер-Лашэз, Луўр, Нотр-Дам... Уражанняў на ўсё жыццё хопіць! Але пакідаючы Парыж, я адчувала, што так па-сапраўднаму і не пазнаёмілася з ім — не хапіла грошай і часу.

Узняўшыся на Эйфелеву вежу, можна прачытаць на адной назіральнай пляцоўцы, колькі кіламетраў ад гэтага месца да Масквы, колькі да розных гарадоў Амерыкі, Аўстраліі, Афрыкі. І да Токіо таксама. Мабыць, туды як раз бліжэй за ўсё — бо вакол, здаецца, адны японцы. Купляюць самыя дарагія сувеніры, частуюцца марожаным (хутка пералічваю кошт адной порцыі на нашы грошы — каля 30 рублёў, «гуляць дык гуляць!» не атрымліваецца, бо прыкладна столькі ж каштуе, білет у Луўр, а там я пакуль не была.

У Луўры таксама мноства японцаў. Чацвертая частка ўсіх наведвальнікаў. У багацейшай кніжнай краме, што размешчана ў холе музея, яны не толькі разглядаюць, але і купляюць таўшчэзныя, фантастычна аформленыя альбомы па самых розных перыядах і напрамках сусветнага выяўленчага мастацтва. Альбомы прадаюцца на англійскай, нямецкай, японскай, польскай мовах. На рускай не бачыла ніводнага...

Некалькі разоў назірала, як прыходзіў да парыжскага перона адзін і той жа цягнік. Вельмі прыгожы — можа быць цягнік такім! І прыгожыя выходзілі з яго пасажыры. Без чамаданаў, зусім не ў спартыўным адзенні, наадварот, у шыкоўным. Гэта ў пятніцу вечарам заходнія немцы, бельгійцы, англічане прыязджалі ў Парыж, каб правесці тут уік-энд. Пабываць ў славутай «Гранд Опера», пасядзець у маленькім рэстаранчыку, паглядаючы, па прыкладу парыжан, на прахожых, бо ёсць столікі, якія стаяць прама на тратуары. Прывесці дадому маленькі пакецік з чароўнай назвай «Крысціян Дыор», куплены ў самы дарагім магазіне на Елісейскіх палях. Калі не хапіла часу на Луўр, можна вярнуцца да яго ў адзін з наступных выхадных, праз тыдзень ці два, тым больш, калі з дзяцінства з ім знаёмы не толькі па кнігах, фільмах і паштоўках.

...Аднойчы я спынілася каля банка і да мяне адразу пыдышла дзяўчына — яна, наіўная, падумала, што я ўвайсці ў яго хачу, але не ведаю як. Загаварыла са мной па-французску, і я адказала амаль адзінай фразай, якую ведаю: «Я не размаўляю па-французску». Тады яна паўтарыла пытанне па-англійску, а на гэтай мове я здолела растлумачыць, што прыехала з Савецкага Саюза. І дзяўчына пачала размаўляць... па-руску. Добра, амаль без памылак. Вывучала яна нашу мову ў сваёй роднай краіне — Швецыі, у сярэдняй школе. Я вывучала англійскую мову і ў сярэдняй школе, і ва ўніверсітэце. А вольна размаўляць на ёй так і не ўмею...

На другі тыдзень у Парыжы мне ўжо хацелася дадому. Вярнулася — і спакойна ў першы ж дзень у наш магазін пайшла. Гэта ж норма — вось такія тавары, вось такі асартымент, вось такія сумкі ў руках жанчын. А ТАМ быў нейкі безупынны абсурд, нейкі бязглузды сон, ад якога лепш хутчэй прачнуцца, каб не стаў ён летаргічным.

Па праўдзе — зноў хочацца ў Парыж. Ці ў Лондан. Або ў Рым. Ды і ў Нью-Йорк было б нядрэнна. На два выхадныя дні, з тымі грашыма, якія ў мяне былі на тры тыдні ў Парыжы. Калі ехаць туды зноў — толькі каб не хадзіць па магазінах. Зазірнуць хуценька ў адзін які-небудзь самы дарагі — па касцюм «ад Кардэна». А лепш дастаць на Елісейскіх палях самы прыгожы касцюм з уласнага чамадана. Савецкі касцюм з савецкага чамадана. Надзець яго, высока падняць галаву і — амаль не заўважаць, як самыя элегантныя мужчыны спыняюцца, каб даўжэй паглядзець на цябе. Будзе калі-небудзь такое са мной? Няхай бы хоць з дачкой ці ўнучкай маёй...

Не, усё ж і са мной таксама! Хачу зноў сустрэцца са сваім дыханнем, пакінутым недзе ў неабдымным парыжскім небе...

В. БЯГУН.

ГРОМ ГРЫМНУЎ

«У хованкі з агнём»



Заметка з такой назвай была надрукавана 15 сакавіка. «Агонь рэдка жартуе. Няўжо для таго, каб мы сабе гэта ўсвядомілі, патрэбна надзвычайнае здарэнне, пры якім хавацца прыйдзецца нам самім?» — так яна заканчвалася. Два тыдні заставалася для роздуму ў адміністрацыі студгарадка...

28 сакавіка ў 10 гадзін на пункт сувязі пажарнай часці паступіў сігнал аб пажары ў інтэрнаце № 5 па вуліцы Кастрычніцкай, 4.

Прыбыўшы на месца выкліку, мы ўбачылі дым з вакон чацвёртага і пятага паверхаў, мноства людзей каля ўваходу ў інтэрнат. Хутка па лесвіцы, яшчэ хутчэй па калідоры: магчыма, у пакоях людзі, якім патрэбна дапамога? І вось пажар патушаны. Пацярпеўшых няма. Усё добра? На жаль, не...

Толькі прамы ўрон будынку інтэрната склаў звыш 2 тысяч рублёў, урон маёмасці студэнтаў — каля 3,5 тысяч рублёў. Расследаванне «па гарачых слядах» паказала, што нягледзячы на ўсе забароны, у пакоях інтэрната карыстаюцца электрычнымі пліткамі і камінамі, каларыферамі. А ў пажарных кранах на чацвёртымі і пятым паверхах не было вады.

Некалькі чалавек з адміністрацыі БДУ прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці, узбуджана крымінальная справа.

Такім чынам, гром грымнуў. Дык калі ж «мужык перахрысціцца» — калі адміністрацыя студгарадка возьмецца за справу?

А. ФІЛОН,
інжынер Дзяржпажнагляду
СВПЧ-1 па ахове Ленінскага раёна.

САКРЭТ ФІРМЫ

Бюджэтнае сальда студэнта ФРГ

Ну каго ў наш вялікі час датычаць праблемы маленькага чалавека? Скажам, «серадняка»-студэнта. Зброя яго абаронцаў дэлегатаў Усесаюзнага студэнцкага форума, каб дагадзіць усеагульнай гігантаманіі, унушальная па памерах і ненадзейная ў карыстанні: што могуць трынаццаць самых правільных рэзалюцый супраць упартых лічбаў? Затраты на навучанне на душу насельніцтва ў 1985 годзе: у ЗША — у 6, у Японіі — у 4, у Францыі — у 3,7 раза болей, чым у СССР. Але і праз дзесяцігоддзе міністры не раяць нам бегчы навыперадкі з развітымі капіталістычнымі краінамі.

Зразумела, у такім становішчы рукі да кожнага студэнта не даходзяць. Цікавіцца дэбітам і крэдытам «серадняка» спецыялісты-сацыёлагі пакуль асцерагаюцца. І дарма. Бо там, на Захадзе, усё падлічыўшы, толькі выйгралі: ведаюць, з кім і за што змагацца. Бюджэтнае сальда дапамагаюць выводзіць арганізацыі навучэнскай моладзі. У ФРГ — «Студэнцкая справа». Вось якім яно атрымліваецца.

Памер даходаў так званага сярэдняга студэнта складае 1002 маркі ў месяц: 366 марак — бацькоўскія «датацыі», каля 148 марак даплачвае дзяржава, працэнты ад асабістых зберажэнняў (з дзяцінства — на ўсялякі выпадак) — яшчэ 123 маркі, астатняе — гарантуе права студэнта на работу, прычым, сума да 250 марак не абкладваецца падаткам.

За кошт скідак на сталовую і адзенне маладыя людзі эканомяць у сярэднім 102 маркі. Іх хапіла б, напрыклад, на 34 сасіскі ў самай таннай прывакзальнай забягалаўцы. Кошт прамысловых тавараў моцна вар'іруецца ў залежнасці ад якасці, таму можна выбраць тое, што па кішэні.

Сярэднія расходы студэнтаў у ФРГ складаюць 951 марку ў месяц. Каля 302 марак каштуе жыллё. На харчаванне, паводле самых сціплых падлікаў, ідзе 220 марак, на мыццё бялізны, рамонт абутку — 62 маркі. Аплата праезду ў грамадскім транспарце складае за месяц каля 100 марак. Таму самыя эканомныя аддаюць перавагу веласіпеду.

Што яшчэ? 56 марак на вучэбныя і канцылярскія патрэбы. 186 марак у месяц — кішэнныя грошы: 17 марак на набыццё газет, часопісаў і кніг, 19 — на наведванне тэатра і кіно, 45 — на хобі. Іншыя расходы (карыстанне тэлефонам, заняткі спортам, медыцынскае абслугоўванне, прадметы гігіены) складаюць 186 марак.

У. КРАСНАКУЦКІ.

ЗАВОЧНАЯ ШКОЛА СТЭНАГРАФІІ

СЦІПЛЫЯ ЛІТАРЫ

Ад літары Г са звычайнага алфавіту стэнаграфічныя знакі Г і ГР адрозніваюцца сціпласцю. Яны зусім не выгінаюць шыі, не імкнуцца быць падобнымі да лебедзя.



правільна неправільна

Знакі пачынаюцца закругленнем, як СТ, і заканчваюцца закругленнем, як літара К. А ў сярэдзіне знакаў лінія прамая.



его иго сего всего легко гид гипс бег брег бриг лег



греть грели греться гребли грести подгрести игры

Скарачэнні (і вытворныя):



говор, год говори годы говорили говорил говорить говорим



говорение выговор сегодня гимн гимны где город городе

ПРАКТЫКАВАННЕ:

Слег лешего пешего миг сиг иглы игле легки грим грек тигр сгрести сгреб игре погреби грел грелки

Где вы были сегодня? Мы были в городе. Это город Брест. Сегодня в городе. Дети в школе пели гимны. Вы говорили о городе. Так говорили Маркс и Энгельс. С кем вы говорили. Город и село. Мы все быстро гребли. Ленин говорил о классовой борьбе. Мы в школе говорим о плане. В те годы мы были в городе.

Заўвага: Калі ўсе словы пішуцца надта коратка, таксама не вельмі зручна. Пяро часта адрываецца ад паперы, і рытмічнасць парушаецца. Каб захаваць яе, кароткія словы можна аб'яднаць у групы. Групуйце не выпадковыя словы, а тыя, якія часта сустракаюцца разам, складаюць устойлівыя спалучэнні. У дадзеным практыкаванні можна аб'яднаць словы «в те годы», «в городе».

ХТО ЦЯГНЕ Ў БАЛОТА?

(Галосная О ў сярэдзіне слова)

Так, гэта галосная О хоча спіхнуць знакі ўніз. напішам ЛО і дабавім М:



ло лом

Паколькі галосная О паказала сябе апусканнем знакаў, то ўжо не мае значэння, ці падобна спалучальная лінія на галосную.

лом лом

У першым выпадку спалучальная лінія падобная на галосную, у другім — не. Але абодва напісанні правільныя: М апушчана ўніз.

дом бром гром броситься гроши брошки лось косы ломом

Малыя знакі апускаюцца амаль цалкам. Аднамерныя — на 1/2 меры:

кот соты игрок исток грот плот пилот вот тот селом болото

Правіла радковасці дазваляе не скідваць вялікія знакі глыбока ўніз, а заканчваць слова на ўзроўні першага апушчанага знака.

болото колокол колосок молоко колобок долото

Двухмерныя знакі таксама прыемна пісаць пасля галоснай О. Верхняя частка знака выраўноўваецца па кантрольнай лініі:

сов слов шов брось следов поп клоп лодки стропы погреб

Скарачэнні (і вытворныя):

помощь помощи после государство государстве потом документ

договор восток востоке готов готовы готовиться готовили

ПРАКТЫКАВАННЕ:

Бросили летом светом ломиться косили томиться том (л)ение томом комом сомом косом лесом пледом селом веслом кошки дот боты домом кок сок коком брелок док ток строк шок поле соли полет колет колесо дол идол тол молили стол болит построение гол иголки костры гости пост достиг тосты мосты лоб добыли дог мог строг бог плов стопы кобры плоды весов плесов лесов броситься строки плод плоды.

Быстро плыл плот. Мы едем в гости. Между строк. Плыли лодки. Поле колосится. Государство и власть. В документе были все подписи. Летом спели плоды. Мы готовили документы. Колесо вошло в болото.

Урок вёў
Уладзіслаў ГЕРАСІМАЎ.

ДЛЯ ЦЯБЕ

ВЕДАЕЦЕ?

Крывяны прадказальнік

Група крыві — ключ да індывідуальнасці. Так сцвярджаюць японскія псіхолагі.

Уладальнікі шлюбных бюро маюць усё больш цяжкасцей са знаходжаннем партнёраў для жанчын з групай крыві B (III), таму што яны лічацца занадта самастойнымі, даражаць сваёй воляй, непастаянныя ў густах і настроі.

Уладальнікі рэстаранаў часцей наймаюць на работу асоб з групай крыві A (II), таму што яны пачцівыя, сумленныя і ўмеюць працаваць нават ва ўмовах моцнага стрэсу.

Стаць кіраўніком дапамажа група крыві O (I), якая абумоўлівае энергічнасць, здольнасць быць патрабавальным да сябе і іншых.

Асобы з групай A (II) схільныя да так званых хвароб цывілізацыі: інфаркту міякарда, атэрасклярозу, рэўматызму, мочакаменнай хваробы, дыябету і нават новаўтварэнняў.

Асобы з групай крыві O (I) маюць павышаную жыццёвую ўстойлівасць. З хвароб для іх характэрныя толькі язвы страўніка і 12-перснай кішкі. Таму яны як правіла доўга жывуць.

Асобы з групай крыві B (II) знаходзяцца як бы пасярэдзіне паміж A (II) і O (I) у гэтым плане.

Група крыві A (II) — у асоб сумленных, абавязковых, можна сказаць, блізкіх да дасканаласці. Калі яны за штонебудзь бяруцца — стараюцца не падкачаць. Іх згода абазначае надзейнасць і выклікае давер, тое ж самае адносіцца да іх асабістых кантактаў: яны застаюцца вернымі людзям, з якімі пасябравалі. Асобы з гэтай групай крыві інтэлігентныя і быццам бы больш высакародныя за ўладальнікаў іншых груп. Гэта больш характэрна для жанчын — носьбітаў данай групы крыві.

Група крыві B (III) — у людзей вельмі ўражлівых, далікатных, з вялікімі здольнасцямі, безадмоўных. У рабоце яны аднолькава — як да сябе, так і да іншых — прад'яўляюць вельмі высокія патрабаванні. Яны спакойныя, але пад гэтым спакоем хаваецца часта ранімае сэрца. Іх пачуцці, аднак, могуць вельмі бурна ўзрывацца, асабліва калі справа датычыцца кахання. Жанчыны вельмі раўнівыя — значна больш, чым мужчыны з гэтай групай крыві.

Група крыві AB (IV) — у асоб, стрыманых у праяўленні сваіх пачуццяў, недаацэньваючых свае якасці, і таму яны кідаюцца ў сваіх перажываннях, няўпэўненыя і ва ўсім сумняваюцца. Усялякія канфлікты яны перажываюць у адзіноце, нікому не спавядаючыся. Аднак у каханні, дружбе і шлюбе яны блізкія да ідэалу, таму што жадаюць шчасця не толькі для сябе, але і стараюцца адарыць ім партнёра.

Група крыві O (I) — у асоб у «вечным руху», энергічных, валодаючых прабіўнымі здольнасцямі, сілай волі, уменнем кантактаваць з людзьмі. Не выпадкова гэта група крыві ў асоб, якія дасягнулі многа ў дзелавым жыцці.

О, ЖАНЧЫНЫ!

ЖАЛЕЗА САГРАЕ

Жанчыны часта мерзнуць. Эксперымент, які правялі амерыканскія вучоныя, паказаў, што прычына ў недахопе жалеза, якое скарыстоўваюць у ежы. У жаночым арганізме яго звычайна значна менш, чым у мужчынскім.

ДЭФІЦЫТ НЯВЕСТ

Англійскія дзяўчаты, якія імкнуцца да незалежнага жыцця, не спяшаюцца выйсці замуж. Попыт на нявест у Англіі значны — 250 тысяч. Такія дадзеныя чарговага анкетнага апытання ў гэтай краіне.

ХОЧАЦЕ ПАХУДЗЕЦЬ?

Для гэтага можна выкарыстаць спосаб Стэлы Тэйлар, манахіні ў мінулым. На працягу 65 гадзін яна праплыла ў басейне 280 кіламетраў і пазбавілася ад некалькіх кілаграмаў лішняй вагі.

СВЯШЧЭННАСЛУЖЫЦЕЛЬ-КІ

Ламбецкая канферэнцыя прадстаўнікоў англійскай царквы выказалася за ўзвядзенне жанчын у сан епіскапаў.

У верасні 1987 года ў рэлігійных цырымоніях, на пахаваннях разам са святарамі мужчынамі прымала ўдзел і жанчына-мула. Гэта была адна з выпускніц спецыяльнай багаслоўскай школы ў Тэгеране, якая створана пад патранажам Фарыдэ Мустафаві — дачкі аеталы Хамяйні.

РУКУ ПРАПАНУЕ ЖАНЧЫНА

Недалёка ад гарадка Імілхінь на беразе возера, каля Атласкіх гор, штогод праходзіць незвычайны кірмаш жаніхоў. Жанчыны племені айт-хадзіду, якія тут жывуць, могуць выбраць спадарожніка жыцця.

ПАГАВОРЫМ НА «ЖАНОЧАЙ МОВЕ»?

Яна захавана да нашых дзён. Не, гэта не тая гаворка, якой жанчыны карыстаюцца ў чэргах і цырульнях. Гэта сапраўдная мова, якую прадстаўніцы цудоўнай паловы чалавецтва выкарыстоўваюць толькі ў размовах паміж сабой, і толькі яны могуць яе зразумець.

У Паўночнай Амерыцы ў раёне Місісіпі еўрапейцы засталі племя індзейцаў натчы. Акрамя агульнай мовы, на якой размаўляла ўсё племя, у жанчын існавала свая мова або жаргон.

Многія этнографы лічаць, што асобныя жаночыя мовы, якія яны старанна захоўваюць ад чужых,— памяць пра тайныя саюзы жанчын, якія змагаліся супраць улады мужчын.

...І ГАТАВАЛІ АТРУТУ

Да нашых дзён існуюць некаторыя тайныя жаночыя саюзы. Напрыклад, «Ніенга» і «Лезіму» ў Афрыцы. Яны стагоддзямі трымалі ўсё мужчынскае насельніцтва ў пастаянным страху.

Жанчыны аднаго з буйнейшых таварыстваў «Бунду» ў Нігерыі малявалі твар і рукі ў белы колер і насілі аднолькавыя чорныя мантыі. Падобны саюз існаваў і ў Гане. Трапляючы ў яго, дзяўчына атрымлівала новае імя. Тут яе вучылі спяваць, плесці цыноўкі. А завяршала курс навук майстэрства састаўлення атруты. Калі жанчына выходзіла замуж, яна заставалася членам гэтай усемагутнай арганізацыі. Пакрыўджаная мужам у сварцы, яна магла звярнуцца за дапамогай у саюз, які быў у стане пакараць мужа або прымусіць заплаціць вялікі штраф.

ВАЗЬМІЦЕ НА ЗАМЕТКУ

Ці ўмееце вы слухаць?

Ці часта задумваліся вы над пытаннем: «А ці ўмею я слухаць?» Падазраю, што не вельмі. Тым не менш згадзіцеся, ад таго, якія (уважлівыя ці не надта) слухачы мы самі, кожны з нас у размове з субяседнікам абавязкова хоча быць выслуханым. Мы чакаем разумення, падтрымкі, а часам і спагады. І як прыемна, калі той, з кім вы дзеліцеся радасцю ці горам, поспехам ці няўдачай, правільна зразумее вас і раздзеліць вашы пачуцці: радасць становіцца большай удвайне, а непрыемнасць, дзякуючы разважлівасці і падтрымцы другога чалавека, перажываецца лягчэй.



Прапануем вам некаторыя запісы, зробленыя на палях кнігі Іствуда Атватэра «Я вас слухаю...»

Чуць і слухаць — дзве розныя рэчы. Чуць мы можам, не задумваючыся. Але слухаць — для гэтага неабходна пастаянная сканцэнтраванасць на прадмеце гутаркі. Слухаючы, мы можам актыўна ўдзельнічаць у размове, працягваць яе. Калі верыць Атватэру, мужчына звычайна слухае ўважліва толькі 10—15 секунд, затым ён пачынае слухаць сябе. Жанчына ж, размаўляючы з субяседнікам, хутчэй убачыць яго як асобу, зразумее пачуцці таго, хто гаворыць.

Калі вы хочаце, каб вам адкрылі душу, пастарайцеся пазбегнуць тых матываў і інтанацый, якія перашкаджаюць субяседніку быць больш шчырым з вамі, калі наогул не пазбавяць жадання працягваць размову. У гэтай незайздроснай ролі могуць выступіць:

загад, каманда («Паўтарыце яшчэ раз!», «Паўтарыце павольней!»);

папярэджанне, пагроза, абяцанне («Супакойцеся, я вас ахвотна слухаю», «Вы пашкадуеце, калі зробіце гэта»);

павучанне («Гэта няправільна», «Вам дарэчы пайсці першым»);

парада, рэкамендацыя, рашэнне («Чаму б вам не сказаць так?», «Я б прапанаваў абвергнуць гэта»);

павучанне, лагічная аргументацыя («Паглядзіце на гэта інакш», «У вашым узросце я такога не меў»);

асуджэнне, крытыка, абвінавачванне («Тое, што вы зрабілі, недарэчна», «О, больш не магу з вамі спрачацца»);

пахвальба, згода («Я лічу, што вы маеце рацыію», «Гэта было выдатна»);

сварка, неабгрунтаванае абагульненне («Усе жанчыны аднолькавыя»);

інтэрпрэтацыя, аналіз, дыягностыка («Вы сапраўды ў гэта верыце, ці не так?», «Зараз мне зразумела, чаму вы гэта зрабілі»);

супакойванне, спагада, суцяшэнне («Наступны раз вы будзеце адчуваць сябе лепш», «Усе робяць памылкі»);

высвятленне, допыт («Хто вас навучыў?», «Што вы зробіце на наступны раз?»);

ухіленне ад праблемы, адцягненне ўвагі, жарт («Чаму б вам не выкінуць гэта з галавы?», «А што, калі кожны раз, калі нешта не атрымліваецца, кінуць займацца гэтым?»).

Памятаеце, колькі разоў гэта «нешта» перашкаджала вам у размове, і як часта рвалася ніць зносін. А разгадка, аказваецца, была простаю.

Слухаць таксама можна па-рознаму. Напэўна, самы распаўсюджаны від — уважлівае маўчанне, або, як яго называюць, НЕРЭФЛЕКСІЎНАЕ СЛУХАННЕ. У даным выпадку гаворыць у асноўным субяседнік, і толькі вашы фразы накшталт: «Так», «Як гэта?», «Разумею Вас» і самыя простыя адказы дапамогуць змястоўна працягваць размову. Нейтральная рэпліка адабрае субяседніка. Праўда, часам гэта не задавальняе таго, хто гаворыць, бо перашкаджае яго самавыяўленню.

РЭФЛЕКСІЎНАЕ СЛУХАННЕ. Вы ўступаеце ў размову і выкарыстоўваеце: высвятленне, адлюстраванне пачуццяў і рэзюміраванне.

Высвятленне — гэта калі вы імкняцеся ўдакладніць тое, аб чым ідзе размова. Могуць быць карыснымі наступныя фразы: «Ці не паўторыце Вы яшчэ раз?», «Я не зразумеў», «Растлумачце, калі ласка!»

Адлюстроўваючы пачуцці субяседніка, мы паказваем яму, што разумеем яго стан. Дзякуючы адлюстраванню пачуццяў той, хто гаворыць, усведамляе свой эмацыянальны стан.

Рэзюміруючыя адказы падсумоўваюць асноўныя ідэі і пачуцці субяседніка. Гэта асабліва да месца ў сітуацыях, якія ўзнікаюць пры абмеркаванні розных пунктаў гледжання, урэгуляванні канфліктаў.

Наступны від слухання — УСТАНОЎКА. Маюцца на ўвазе разумныя і эмацыянальныя адносіны да чалавека ці з'явы ў выглядзе адабрэння, самаадабрэння, эмпатыі.

І, нарэшце, апошні від — МОВА ЖЭСТАЎ. Гэта выраз твару, інтанацыя, тэмбр голасу, позы і жэсты. Вось аб чым, напрыклад, гавораць: скрыжаваныя рукі —скептычная, абаронная ўстаноўка; нескрыжаваныя — устаноўка даверу; рукі, заведзеныя за галаву,— перавага над іншым і г. д.

Варта спыніцца і на прыёмах уважлівага слухання. Атватэр дае наступныя парады:

1. Высветліце свае звычкі слухаць.

2. Не імкніцеся пазбавіць сябе ад адказнасці за зносіны. Памятайце, што ў размове ўдзельнічаюць два чалавекі: адзін гаворыць, другі слухае, прычым у ролі слухача кожны павінен выступаць папераменна.

3. Будзьце фізічна ўважлівымі. Павярніцеся тварам да таго, хто гаворыць.

4. Сканцэнтруйце ўвагу на тым, што гаворыць субяседнік.

5. Паспрабуйце зразумець не толькі сэнс слоў, але і пачуцці субяседніка.

6. Прытрымлівайцеся адабральнай устаноўкі ў адносінах да таго, хто гаворыць.

7. Паспрабуйце выказаць разуменне. Карыстайцеся прыёмамі рэфлексіўнага слухання, каб зразумець, што ў сапраўднасці адчувае субяседнік.

8. Слухайце самога сябе.

9. Адказвайце на просьбы адпаведнымі дзеяннямі.

Слухаючы субяседніка, ніколі:

— не прымайце маўчанне за ўвагу. Калі субяседнік маўчыць, гэта не значыць, што ён слухае;

— не прыкідвайцеся, што слухаеце,— гэта дарэмна;

— не перабівайце без неабходнасці;

— не рабіце паспешлівых вывадаў;

— не дайце злавіць сябе. Неабходна абавязкова выслухаць субяседніка да канца, каб зразумець, з чым менавіта вы не згодны;

— не гаварыце: «Я добра разумею Вашы пачуцці». Такое выказванне служыць больш для апраўдання ўласных (і беспаспяховых) спроб пераканаць субяседніка ў тым, што вы слухаеце.

— не будзьце празмерна адчувальнымі да эмацыянальных слоў;

— не давайце парад, пакуль не просяць. Няпрошаную параду дае, як правіла, той, хто ніколі не дапамажа;

— не прыкрывайцеся слуханнем, як панцэяй.

Варта памятаць, што эфектыўнае слуханне — гэта аснова атрымання дакладнай інфармацыі. Слухаючы іншых, мы пазнаём саміх сябе. Прыёмы эфектыўнага слухання, нарэшце, дазволяць павышаць якасць прымаемых рашэнняў.

Карацей, ад чуць — да слухаць!

Падрыхтаваў С. ШАПРАН.

Рубрыку «Для цябе» вядзе Вераніка БЯГУН.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

19 КРАСАВІКА
Зак. 2011.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.